І. А. Мельнікаў

# ШТРАФНЫЯ ЧАСТКІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВЕРМАХТА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ: КАМПАРАТЫЎНЫ АНАЛІЗ

*Разглядаецца дзейнасць і праводзіцца кампаратыўны аналіз штарафных частак Чырвонай Арміі і Вермахта падчас Вялікай Айчыннай вайны.*

Першае штрафное падраздзяленне ў Германіі з'явілася ў 1936 г. з ліку ваенных заняволеных, асуджаных па палітычных матывах. У 1939 г. налічвалася 8 такіх частак. У іх утрымліваліся больш за 5000 ваеннаслужачых, што здзейснілі розныя правапарушэнні. Выкарыстоўвалі іх у асноўным як ваенна-будаўнічыя сапёрныя часткі. Пасля пераможнай польскай кампаніі сітуацыя змянілася і дысцыплінарныя батальёны расфарміравалі. Аднак падчас контрнаступлення Чырвонай Арміі пад Масквой, пачаўшагася ў пачатку снежня 1941 г. група армій "Цэнтр" апынулася на краі бездані. Сваіх пасад пазбавіліся вышэйшыя афіцэры. Салдат жа, што дэзерціравалі з фронта, расстрэльвалі на месцы. Навёўшы парадак на пазіцыях, гітлераўскае кіраўніцтва стварыла на Усходнім фронце 100 штрафных рот (частак выпрабавальнага тэрміну). На кожнага правапарушальніка завадзілі крымінальную стправу. Прысуды складалі ад паўгода да пяці гадоў. Акрамя гэтых батальёнаў 1 кастрычніка 1942 г. былі створаны т.зв. "фармацыі салдат другога класа" – 999-я батальёны і выпрабавальныя ўстановы Арганізацыі Тодта. Апошнія можна назваць ваеннымі катаргамі. Сюды траплялі тыя, хто здзяйснялі сур'ёзныя крымінальныя злачынствы, адмаўляліся ад выканання загаду, білі камандзіраў ці былі заўважаны ў актыўным супраціве нацысцкаму рэжыму. Сюды ж накіроўвалі тых, хто не выправіўся ў 500-х батальёнах. Трапіўшых сюды ваеннаслужачых пазбаўлялі выслугі, звання і ўзнагарод. Калі параўноўваць штрафныя часткі па абедзве лініі фронту, можна заўважыць, што ў савецкія штрафныя падраздзяленні ваеннаслужачых накіроўвалі на тэрмін ад 1 да 3 месяцаў, а ў нямецкія адразу на 3 – 4 месяцы. Далей розніца больш істотная. З савецкай штрафной часткі датэрміновае вызваленне (па раненні, за подзвігі) было магчыма і шырока практыкавалася, а з нямецкай не. У Чырвонай Арміі пасля вызвалення са штрафной часткі ваеннаслужачага заўсёды вярталі ў сваю частку з аднаўленнем у званні і пасадзе, вяртаннем узнагарод. У Вермахце салдаты не маглі загладзіць сваю віну крывёю. Там пасля выздараўлення ў госпіталі салдат вяртаўся ў свой штрафбат. Ніякіх узнагарод ў нямецкім штрафбаце не давалі.

Колькасць нямецкіх штрафнікоў на Усходнім фронце была дакладна вызначанай – 16500 чалавек, што адпавядала штату пяхотнай дывізіі. 100 штрафных рот раўнамерна размеркавалі па ўсяму савецка-германскаму фронту. Пры гэтым няўхільна выконваўся прынцып каставасці: існавалі афіцэрскія, унтэр-афіцэрскія і салдацкія штрафныя роты. Часам з тактычных меркаванняў іх аб'ядноўвалі ў батальён. Гэтыя часткі накіроўвалі на самыя небяспечныя месцы без прыкрыцця артылерыі, танкаў і авіяцыі. Па афіцыйных звестках, праз сістэму нямецкіх штрафных батальёнаў падчас вайны прайшло 198 тыс. чалавек.

Такім чынам, стварэнне і выкарыстанне штрафных падраздзяленняў у частках Чырвонай Арміі і Вермахта ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў многім было мерай вымушанай. Але яны проста ў сілу сваёй колькаснага складу не маглі адыграць галоўнай ролі ў баявых дзеяннях.

*Мельников Иван Олегович*, студент факультета информационных технологий и управления БГУИР, ivandragonnn@mail.ru
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна*, заведующий кафедрой, кандидат исторических наук, доцент

Библиотека БГУИР